# Цікавыя факты пра Сож

Гэта рака — левы прыток Дняпра. Пачынаецца яна за 12 км на поудзень ад Смаленска, працякае па тэрыторьм Смаленскай вобласц! Расіі, Маплёускай і Гомельскай абласцей Веnарусі і зліваецца з Дняпром амаль на мяжы з Украшай, недалёка ад гарадскога пасёлка Лоеў. Па Сожы часткова праходзіць як беларуска-расіская, так і беларуска-украшская мяжа.

Даужыня ракі — 648 кіламетраў, з іх 493 прыходзяцца на тэрыторыю Беларусі 155 — на тэрыторыю Расіі. Пасля Прыпяці гэта другі па велічыне і воднасці прыток Дняпра.

Агульная плошча вадазбору Сожа — 42140 км$^2$, на тэрыторыі Беларусі — 21700 км$^2$. У межах нашай краіны больш за 300 рэк і ручаёў яго басейну часткова або цалкам каналізаваныя, пракладзена больш за 170 меліярацыйных каналаў даужынёй 5 км і больш.

У сярэднім і ніжнім цячэнні Сож працякае праз тэрыторьи, забруджаныя радыенуклідамі у вышку аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Асноуныя прытокі ракі: левыя — Асцёр, Хмара, Іпуць, Беседзь, Покаць, Уць; правый — Віхра, Проня, Уза, Добрыч, Чачора, Ліпа. Уніз па цячэнні на ёй стаяць беларускія гарады Крычаў, Чэрыкаў, Слаўгарад, Чачэрск, Ветка, Гомель.

Рэчышца Сожа звілістае, у ніжнім цячэнні можна убачыць вялікую колькасць лукавін, рукавоў, старыц. Да Гомеля трапляюцца астравы, даужыня ягах не перавышае 300 м, а шырыня — 50 м.

Сож быў цэнтральнай ракой для усходнеславянскага племені радзімічы і адной з частак гандлёвага шляху «з вараг у грэкі». Гэта суднаходная рака, вядомая з глыбокай старажытнасці Сёння пры высокіх узроўнях вады суднаходства наладжана ад вёсцы Барысавічы Клімавіцкага раёна Магілёўскай вобласці (за 373 км ад вусця), а рэгулярнае — ад Слаўгарада. Дзякуючы суднаходству на Сожы з'явіуся і Гомель, там знаходзіцца рачны порт.

Існуе некалькі верст узнікнення назвы ракі:

- ад «шош» (ручай, рака), на мансійскай мове — «сос» (рака), на мове комі — «сос» (рукаў ракі);
- ад старажытнарускага «сохокь» (выпаленыя ўчасткі лесу, падрыхтаваныя да ўзворвання);
- ад фінскага susi (воук).

На картах XVI ст. можна знайсці яшчэ адну назву гэтай ракі — Nereia flumen («Нэрэя флюмэн»), што азначае «цячэнне, рака Нэрэя». Па адной з верст, яна паходзщь ад геаграфічных тэрмінаў балцічных моў — літоўскага n’erija і латышскага nerija у значэннях «вузкая доўгая пясчаная паласа», «водмель у моры уздоуж берага». Сапрауды, шырокія пясчаныя палосы цягнуца ўздоўж прыбярэжных участкау на усёй працягласці ракі.

Сож багаты на акуня, плотку, шчупака, судака, ляшча. Тут таксама водзяцца лінь, залаты карась, верхаводка, украшская мінога, гусцяра

**Источник:** Родная прырода – 2021. – (№4). – С. 48